Толькі раз... А помніцца сустрэча!

Нехта, помню, вельмі хацеў убачыць Парыж, нават казаў, што пасля гэтага ўжо можна і памерці...

Віця — хлопец з беларускай глыбінкі — з маленства марыў пабачыць Мінск. І таму, паступіўшы ў інстытут, першае, што зрабіў — гэта кінуў у інтэрнаце свой чамадан ды падаўся ў сталіцу. Доўга па ёй бадзяўся: назад — літаральна — прыпоўз, амаль апоўначы.

Мы, яго суседзі па пакоі, вядома ж, спыталі, што ўдалося ўбачыць. Віця сказаў: «Ой, хлопцы, вы не паверыце! І пехатой хадзіў, і на трамваях ездзіў — хацеў убачыць, дзе горад канчаецца. Нічагуткі не выйшла! Куды ні пайду — усюды Мінск!»

Для нас гэта фраза стала бессмяротнай. Ды і не дзіва: збылася Віцева мара.

У мяне яна таксама была: з дзяцінства хацелася ў Кіеў. Магчыма, таму, што роднае мястэчка знаходзілася за нейкі кіламетр ад Украіны і ніякіх межаў з ёй тады не было, а вось агульныя святы, вяселлі ды хрэсьбіны — колькі заўгодна! Парк Дружбы быў, сумесныя кірмашы і сустрэчы світанняў, часопіс «Пэрэць», які выпісваў бацька майго першага дружбака...

Карацей, сталіца суседкі Украіны горад-герой Кіеў уяўлялася мне тым самым Парыжам ці Віцевым Мінскам.

І вось паспяхова завершана камандзіроўка на металургічны камбінат у Днепрадзяржынску (цяпер горад Каменскае), у мяне застаюцца «лішнія» суткі, і ў Мінск я планую вяртацца праз Кіеў. Ну чаму б і не? Начным цягнікам прыязджаю туды, цэлы дзень «працую» турыстам, вечарам зноў у поезд і раніцай на работу...

Чалавек, як вядома, мяркуе. І нават, здараецца, размяркоўвае, але не заўсёды.

Прыгоды пачаліся на пад'ездзе да Кіева, калі наш цягнік раптам спыніўся і правадніца аб'явіла, што гэта — не менш чым на гадзіну, а таму ахвотныя могуць выйсці з вагонаў, пагуляць па лузе ці лесе, пазагараць...

Калі б нехта з нейкага самалёціка зняў тады маіх спадарожнікаў, карціна была б яшчэ тая! Уяўляйце: сонечны жнівеньскі ранак. Цягнік. Паўз яго — мурашнікам — людзі (мужчыны, жанчыны, старыя, дзеці): нехта снедае, замест абруса паслаўшы газету, нехта ляжыць, выставіўшы пуза, нехта гуляе, збірае кветкі ці пайшоў у грыбы...

Недзе гадзіны праз дзве нас папрасілі заняць свае месцы ў вагонах. Для гэтага адных давялося будзіць, другіх — збіраць па полі, гукаць... Я наогул сумняваюся, што адтуль забралі ўсіх.

Такім чынам, мой план па наведванні Кіева трохі скарачаўся, і я загадзя вырашыў на дробязі не разменьвацца — адразу пайсці ў Кіева-Пячэрскую лаўру.

Дагэтуль у памяці, што час там нібы спыніўся. Па старажытных купалах блукалі мяккія промні сонца, між сабой шапталіся дрэвы, старэнькі манах у двары нешта з любасцю расказваў людзям...

А далей болей: шукаючы выхад з Лаўры, я і зусім апынуўся ў... іншым свеце альбо як мінімум у іншым стагоддзі з усімі адтуль наступствамі: па сцежках сквера ў шыкоўных доўгіх сукенках няспешна гулялі дамы з сабачкамі і парасончыкамі ад сонца, побач з імі былі кавалеры ў фраках і цыліндрах, купкамі стаялі афіцэры ў драгунскіх і гусарскіх мундзірах ды заразліва рагаталі (травілі, відаць, анекдоты). Да ўсяго паблізу гойсалі дзеці, прыбраныя зусім не ў сучасныя сукеначкі ды маечкі, чуліся словы «господа», «граф», «княгиня»...

Спачатку думаў, што тут нейкае свята — рэканструкцыя эпохі (але ж нідзе ніякіх гледачоў?), потым — што здымаецца кіно (але ж нідзе ніякіх рэжысёраў-аператараў? А галоўнае — нуль цікавасці да мяне, чужароднага элемента: бадзяюся тут... Адзін... З вялікай дарожнай сумкай, і ніхто нічога не кажа, не праганяе).

Таму я сваімі нагамі (ну не пытаць жа ў нейкага паручніка!) стаў шукаць, дзе выхад з «эпохі»: напрасткі пашыбаваў да глухога завулка, а ўжо там азірнуўся і ў цяньку пад старымі дрэвамі ўбачыў такі ж стары ды вялізны аўтобус з надпісам «Масфільм». Значыць, за спінай такі нешта здымалася, на пляцоўцы, мусіць, быў перапынак, на час якога артысты, каб не выходзіць з вобразаў, «тусаваліся» як тады...

Трэцяй з маіх кіеўскіх прыгод стаў «візіт» да князя Уладзіміра. Помнік яму быў, здавалася, блізка, я, выбраўшы кірунак, рушыў да яго пехатой. Аднак хутка ў парку мой арыенцір згубіўся...

Адступаць не выпадала: я ўспомніў сваю службу ў войску і зрабіў маршкідок напрасткі. Праўда, не ведаў пры гэтым, што наперадзе Уладзімірская горка і схіл яе ну вельмі круты. Уніз я і бег, і скакаў... А ўрэшце з шумам ды трэскам... скаціўся да падножжа помніка і групы замежных турыстаў.

Гіду мову адняло тут жа, французам таксама. І гэта пры тым, што пра тэрарыстаў тады ніхто нічога не чуў і па тэлевізары іх не бачыў...

Давялося хуценька падхапіцца, «аддаць» іншаземцам свой шчыры «пардон» ды спакойна адысці, каб хоць здалёку ўбачыць помнік князю.

...А на цягнік я тады паспеў і з Кіева вывез столькі станоўчых эмоцый!..

Галоўная — я ў гэтым горадзе быў! І вельмі шкада, што толькі аднойчы.

Іван Гаральчук,

г. Мінск.

Хто як жуе, той так жыве?

Не хацелася б паўтараць банальнае: «Шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз страўнік», але ж доля праўды ў гэтым ёсць: многія любяць смачна паесці. А вось гатаваць...

Спачатку для мужчын гэта робяць маці, потым — жонкі і дочкі. Не адставалі раней і аб'екты грамадскага харчавання — тыя ж заводскія сталоўкі.

Дык вось у савецкія часы на адзін буйны хімічны камбінат прыехала камісія з вядомага сталічнага інстытута. Яна мела заданне — вывучыць харчаванне работнікаў, уплыў ежы на іх здароўе.

...Першым у пакой да вучоных заявіўся Юрась: начальства паслала — ён храбра зайшоў. Дактары адразу ж распыталі пра ягоны ўзрост, рост ды вагу, стаж сямейнага жыцця і здароўе. А нарэшце — здзівілі пытаннем:

— Што вы раніцай елі?

Трэба сказаць, што паснедаць Юрась любіў (паабедаць і павячэраць таксама), а ў той панядзелак дык нават шмат што сабе дазволіў... Жонка напярэдадні юбілей спраўляла, нагатавала рознай смакаты, і госці ўсё не з'елі: катлеты засталіся, рыба, халадзец, пірагі...

Карацей, камісія ледзь паспявала запісваць ды распытвала далей: ці смачна гатуюць у сталоўцы, ці хапае рабочым ежы, якую выдаюць па спецыяльных талонах?

— Ды нармальна ўсё, — шчыра адказваў Юрась. — Я ў дадатак толькі беляшоў набіраю...

— І што — з'ядаеце? — не паверыў галоўны з навукоўцаў, бо ўся постаць мужчыны складалася з... кіло касцей ды літра крыві, а так званай тлушчавай праслойкі быў нуль, без палачкі, хоць, кажуць, адну тады і прымалявалі...

Наступным «паддоследным» стаў двухметровы асілак па мянушцы Заяц:

— Я зранку мала ем, — прызнаўся ён людзям вучоным. — Апетыту няма... Сёння на сняданак батон быў.

— З чым? — спыталі дактары. — Колькі лустачак?

— А навошта яго крышыць? — не зразумеў мужчына. — Я ўдоўж разрэзаў, маслам праслаіў і ўсё... Няма апетыту. А вось абед па талонах з'ядаю ўвесь. І беляшы з яешняй бяру...

Навукоўцы зноў не зразумелі нічога, бо тлушчу не знайшлі і ў Зайца.

Трэці суразмоўнік — каржакаваты, нешматслоўны халасцяк па прозвішчы Каваль — заявіў, што раніцай выпівае пяць сырых яек, якія прывозіць з вёскі, ды з'ядае з батонам кварту малака. Ну а далей — абед у сталоўцы. І беляшы — як закон.

...Каго яшчэ апытвала камісія, ужо не ў памяці, але і сама ў сталоўку прыходзіла, беляшы каштавала.

Якія зрабіла высновы, ніхто не ведае, бо ў хуткім часе той інстытут прыкрылі... А вось хімічная прамысловасць — выстаяла. Думаю, таму, што дзеля гэтага працавалі нашы хлопцы — тыя ж Заяц, Каваль і Юрась...

Таццяна Раманава,

г. Наваполацк.

Як Барсучыха агуркі прадавала

У народзе кажуць: «Сей гуркі на Пахома — будзеш цягаць мяхом!»

Дзве суседкі ў нас так і зрабілі. Насенне ў іх дружна ўзышло. І — ці той Пахом дапамог, ці проста лета добрае было — але ж такога ўраджаю жанчыны колькі жывуць — не бачылі! І сабе агуркоў назапасілі, і ўсіх сваіх забяспечылі, а яны ўсё растуць ды растуць.

Вырашылі гаспадынькі, што «лішнія» можна прадаць, нейкі рубель зарабіць. Надвячоркам у пятніцу выбралі (па два мяшкі атрымалася) ды сталі думаць, як жа даставіць. Варыянты былі розныя: альбо на машыне падвязе сын Мінчучыхі ці кватарант Барсучыхі, альбо (у крайнім выпадку) на тачках зацягнуць самі. На тым і разышліся.

Мінчучыха ўвесь вечар назвоньвала сыну — таго ўсё дома не было. Урэшце нявестка сказала, што яго і не будзе — машына зламалася, у Маладзечне заначуе. Значыць, трэба ісці да суседкі, казаць, каб яна дамаўлялася з кватарантам.

Пайшла, пастукала ў шыбу, як ёй здавалася, пабудзіла і ўсё сказала: пра сына, пра яго машыну... А тая, не разабраўшыся і ўбачыўшы, што кватаранта дома няма (хлопец малады, можа, з дзеўкай якой затрымаўся?), стала сама... збірацца на базар. Пачакала яшчэ каля хлеўчыка: думала, суседка падыдзе, дапаможа грузіць. Аднак той не было.

«Відаць, раней панеслася... Хаця ж каб першай быць», — пазлавала на Мінчучыху. Ды рабіць жа няма чаго: сама ўсцягнула мяхі на тачку, пакіравала на базар.

Па дарозе насцярожылася трохі, што спачатку нікога не спаткала, а потым... цэлы натоўп. Ёй бы падумаць, адкуль гэта (мо людзі з апошняга кінасеанса вяртаюцца?), але ж думкі былі пра іншае: як бы найлепшае месца заняць, стаць першай, пакуль не разведнела.

...На рынку і сапраўды было цёмна і пуста: ні табе Мінчучыхі, ні іншых канкурэнтаў. Значыць, можна пасядзець, каб аддыхацца, а потым нарэшце паглядзець на гадзіннік. Стрэлкі яго паказвалі поўнач.

Ала Клемянок,

г. Смаргонь.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

Крызіс жанру

Адмовіўшыся пісаць ручкай, мы страчваем сябе для гісторыі

НА выхадныя перабірала ў роднай хаце дакументы, якія яшчэ не забрала ў Мінск, ратуючы ад вільгаці, што пасяляецца ва ўсіх куточках і шчылінах за зіму, калі ў хаце ніхто не жыве, і выветрываецца канчаткова толькі напрыканцы лета. У старым дэрмацінавым рыдыкюлі часоў мамінай маладосці знайшла пасведчанні аб нараджэнні бацькоў — тоненькія паперкі з выцвілым чарнілам, якія, здаецца, рассыплюцца ў руках, даведку аб рэабілітацыі расстралянага ў 37-м дзеда Валькі, якую бабуля атрымала з КДБ у 67-м, нейкія паявыя кніжкі, што выпісвалі бацькам у тыя ж 60-я гады ўжо мінулага стагоддзя. Асобна, клапатліва загорнутае ў цэлафан, ляжала пісьмо. Напісанае 7 лютага 1955 года, яно ўжо пацерлася на згібах, чарніла паблякла, але чытаць каліграфічныя радкі яшчэ можна.

Гэта пісьмо напісаў мой дзед Васіль маёй маме, калі яна была ў дзясятым класе. Дзед з сям'ёй не жыў: пайшоўшы ў 1939 годзе ў армію ад сям'і з двума малымі дзецьмі, ён на вайне сустрэў іншую жанчыну і застаўся з ёй. Зрабіў добрую ваенную кар'еру, пасля вайны паматаўся па ўсёй вялікай краіне, нарэшце атабарыўся ў Днепрапятроўску. У родную вёску прыехаў толькі праз шаснаццаць гадоў, калі дзеці-пагодкі заканчвалі школу. Яны, можна сказаць, упершыню ўбачылі бацьку, пазнаёміліся з ім. Шмат было эмоцый, прычым не толькі станоўчых, шмат было сказана, яшчэ больш — не сказана. Не вытрымаўшы гэтага нясказанага, дзед з'ехаў з вёскі раней, чым збіраўся. Больш на радзіму ён ніколі не прыязджаў, але з дзецьмі сувязь стараўся падтрымліваць, нават спрабаваў дапамагчы ім уладкавацца ў жыцці. Як яны адносіліся да яго, практычна чужога чалавека, які іх кінуў? З аповедаў мамы я так і не магла зразумець, ці даравала яна. Больш за пачутыя неаднойчы ад яе словы сказаў гэты беражліва загорнуты ў цэлафан аркуш паперы, спісаны дробным уборыстым почыркам, які яна, сама ўжо амаль васьмідзесяцігадовая, захоўвала да канца жыцця, паклаўшы разам з важнымі дакументамі.

ЯНО, пэўна, траплялася мне на вочы і раней, але сесці і ўважліва ўчытацца ў выцвілыя радкі собіла толькі цяпер, амаль праз шэсцьдзясят пяць гадоў, калі няма ўжо на гэтым свеце ні адпраўшчыка, ні адрасата. У пісьме тым — нічога асаблівага: відаць, што пісаў чалавек ваенны, фразы кароткія, выразныя, скупыя на эпітэты. Дзед спрабуе яшчэ раз растлумачыць дарослай ужо дачцэ, як складана яму было прыехаць на радзіму праз шаснаццаць гадоў, піша пра надвор'е — у тым годзе на поўдні Украіны была незвычайна халодная зіма, раіць сыну, як кінуць курыць (не паступова, а адразу), абяцае паклапаціцца аб уладкаванні мамы на гістарычны факультэт, а яе брату паспрыяць у кар'еры ваеннага. Ніякіх асаблівых прызнанняў ці «крылатых фраз», прызначаных для нашчадкаў. Але менавіта гэтыя выцвілыя ад часу радкі нарэшце далі... не, не веданне, веданне было і дагэтуль, — менавіта адчуванне, што жыў на зямлі такі чалавек Васіль Клімовіч, якога я ніколі не ведала, бо ён памёр задоўга да майго нараджэння, і ўва мне цячэ добрая частка яго крыві.

Ці стала мне ад гэтага адчування неяк па-іншаму? Напэўна, не. Проста запоўнілася нейкая лакуна, і гэта вельмі важна. Важна — і ўсё, без ніякіх тлумачэнняў. Якраз той выпадак, калі іх і не трэба шукаць...

ДУМАЮ, не памылюся, калі скажу, што ў кожнай сям'і ёсць падобныя эпісталярныя рэліквіі — пажаўцелыя пісьмы з мінулага стагоддзя, якія пісалі прадзеды і прабабулі з фронту, з далёкіх паездак, з суседняга горада, фотаздымкі з надпісамі на адваротным баку, дзе акрамя «на добрую памяць» можна прачытаць яшчэ шмат цікавага, паштоўкі, падпісаныя да дня нараджэння трыццаць гадоў назад. Яны ціхенька ляжаць дзесьці ў шафе ці шуфлядзе, у альбоме ці ў скрынцы з дакументамі. Яны могуць ляжаць так некранутыя год, два, пяць. Але галоўнае — яны ёсць. Бо надыходзіць нейкі момант — і ты дастаеш гэтыя лісткі і картачкі і, нібы зачараваны, забыўшыся пра ўсе справы і клопаты, пачынаеш іх перабіраць і перачытваць і не можаш адарвацца. Наладжваеш сам для сябе гэткі сеанс амаль містычнай сувязі з роднымі людзьмі, якіх няма сярод жывых, якіх ты, можа, ніколі і не ведаў, але якія пакінулі табе праз час і адлегласць такія вось матэрыяльныя сведчанні, што яны былі на гэтай зямлі, што яны не зніклі з яе бясследна, што яны тыя самыя карэньчыкі, якія моцна трымаюць на зямлі цябе, таго, хто нарадзіўся пасля іх...

І ці не ёсць гэта паглыбленне — тое самае імгненне шчасця, якое так спрабуем злавіць у гэтым шалёным свеце?

КАЛІ так, то ці не пазбаўляем мы гэтага імгнення і яшчэ нейкага вельмі важнага ведання сваіх нашчадкаў? Мы амаль развучыліся, мы не лічым патрэбным нешта пісаць ручкай ці алоўкам на паперы. На камп'ютары, канешне, прасцей — ён нават памылкі падкрэслівае. Але ці перачытае хто гадоў праз дваццаць (пра шэсцьдзясят пяць нават не кажу) нашы хай сабе нават пранікнёныя фразы і самыя разумныя думкі, дасланыя на чыйсьці e-mail сярод сотні іншых пісьмаў? А фота, якія «сябры» «лайкаюць» у сацыяльных сетках, а роўна праз дзень забываюцца пра іх, бо з'яўляюцца новыя, ці знойдзе хто ў віртуальнай прасторы нават праз год?

Не ведаю, як вам, а мне такая перспектыва чамусьці не вельмі даспадобы.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.